Студенты - науке и практике АПК : материалы 96-й Международной научно-практической конференции
(г. Витебск, 25-26 мая 2011 г.) / Витебская государственная академия ветеринарной медицины. - Витебск : ВГАВМ, 2011.

образовании особого образца. Предусмотрен новый документ об образовании - диплом исследователя, который будет выдаваться лицам, успешно закончившим обучение в аспирантуре (адъюнктуре).

Кодекс Республики Беларусь об образовании вступит в силу с 1 сентября 2011 года и позволит не только создать единый, целостный механизм правового регулирования системы образования, но и обеспечить систематизацию и упорядочение правовых норм, сокращение количества нормативных правовых актов в этой сфере, а также устранение существующих недостатков в регулировании образовательных отношений.

УДК 947.6
**ХАМІЦЭВІЧ Я.І**, студэнт
Навуковы кіраўнік **ЮРГЕВІЧ Н.К.,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт
УА "Віцебская ордэна "Знак Пашаны" акадэмія ветэрынарнай медыцыны"
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

## ДЗЕЙНАСЦЬ АРМІІ КРАЁВАЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

Армія Краёва (АК) – узброеная падпольная арганізацыя, якая дзейнічала на акупаванай нацысцкай Германіяй тэрыторыі Польшчы і частцы тэрыторыі СССР (Беларусь, Украіна, Літва) у гады Другой сусветнай вайны і ў першыя пасляваенныя гады. Падпарадкоўвалася эмігранцкаму ўраду ў Лондане і ставіла мэту аднаўлення Польшчы ў межах да верасня 1939 года. Створаная ў лютым 1942 г. на аснове "Саюза ўзброенай барацьбы" АК знаходзілася ў стане вайны як з Германіяй, так і з СССР, хоць маштабных баявых дзеянняў не прадпрымала. Кіраўніцтва АК правяло вялікую працу па стварэнні структуры падпольнай ваеннай арганізацыі, якая ў выніку краху акупацыйнага рэжыму змагла б забяпечыць прыход да ўлады эмігранцкага ўрада і аднаўленне межаў даваеннай Польшчы. На тэрыторыі Беларусі існавалі Навагрудская, Палеская і Віленская акругі АК.

Пасля падпісання 30 ліпеня 1941 г. дагавору аб сумеснай барацьбе з нацызмам паміж Польшчай і СССР акаўцы некаторы час супрацоўнічалі з савецкімі партызанамі. Аднак пасля разрыву дыпламатычных адносін паміж СССР і польскім эміграцкім урадам у красавіку 1943 г. узмацніліся тэндэнцыі да канфрантацыі АК з савецкімі партызанскімі атрадамі, якія атрымалі загад раззбройваць акаўцаў і ствараць польскія савецкія атрады. У канцы 1943 – пачатку 1944 гг. гітлераўцы рабілі спробы прыцягнуць атрады АК да супрацоўніцтва ў мэтах барацьбы з савецкімі партызанамі.

У 1943 г. камандаванне АК зацвердзіла план аперацыі "Бура", які прадугледжваў захоп тэрыторыі Заходняй Беларусі і Віленшчыны ў момант адступлення вермахта і напярэдадні прыходу савецкіх войскаў. Так былі вызвалены гарады Вільня і Львоў. Адразу пасля гэтага пачалася ліквідацыя аддзелаў АК. Частка іх членаў уступіла ў Войска Польскае, іншыя адступілі

на захад, дзе працягвалі барацьбу з нацыстамі, многія былі арыштаваныя савецкімі органамі бяспекі.

Асобныя падраздзяленні АК узаемадзейнічалі з савецкімі партызанамі і часцямі Чырвонай Арміі. Польскі эміgranцкі ўрад і кіраўніцтва Арміі Краёвай узнялі 1 жніўня 1944 г. Варшаўскае паўстанне, якое з прычыны непадрыхтаванасці і няўзгодненасці з камандаваннем Чырвонай Арміі было жорстка задушана гітлераўцамі. У 1944 г. камандаванне АК атрымала загад спыніць узброеную барацьбу супраць савецкай улады і распусціць атрады, аднак асобныя групы акаўцаў займаліся бандытызмам у Заходняй Беларусі нават у пачатку 1950-х гг.

УДК 947.6

**ХАМІЦЭВІЧ Я.І**, студэнт
Навуковы кіраўнік: **ЮРГЕВІЧ Н.К.,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт
УА "Віцебская ордэна "Знак Пашаны" акадэмія ветэрынарнай медыцыны"
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

## УЗ'ЯДНАННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў 1939 ГОДЗЕ. ПЕРШЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСІ

1 верасня 1939 г. нападзеннем Германіі на Польшчу пачалася Другая сусветная вайна. Польская армія не змагла спыніць наступленне нямецкіх войскаў. 17 верасня 1939 г., калі нямецкія войскі занялі практычна ўсе жыццёва важныя цэнтры Польшчы і падышлі да "лініі Керзана", Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу. Да 25 верасня 1939 г. часці Чырвонай Арміі кантралявалі ўсю тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. 2 лістапада 1939 г. сесія Вярхоўнага Савета СССР і 12 лістапада 1939 г. сесія Вярхоўнага Савета БССР прынялі законы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР. У выніку тэрыторыя Беарусі павялічылася са 125,5 тыс. км$^2$ да 225,7 тыс. км$^2$, а насельніцтва − у 2 разы і склала 10,2 млн.  чалавек. Быў ліквідаваны адміністрацыйны падзел і створана 5 новых абласцей – Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская. У'зяднанне Заходняй Беларусі з БССР было актам гістарычнай справядлівасці, скасоўвала ганебны Рыжскі дагавор 1921 г., завяршала шматвяковую барацьбу беларускага народа за нацыянальную незалежнасць.

На далучаных тэрыторыях пачаліся важныя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Ва ўмовах недахопу кадраў у заходнія вобласці БССР прыехала каля 31 тыс. партыйных, камсамольскіх і савецкіх работнікаў, спецыялістаў народнай гаспадаркі і культуры (да мясцовых кадраў яшчэ праяўляўся недавер). Адбывалася будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў, стварэнне калгасна-саўгаснай сістэмы, узвядзенне і адкрыццё школьных будынкаў, культурна-асветных установаў. У 1940 г. у заходніх абласцях была ўведзена савецкая сістэма сацыяльнага забеспячэння.